44-гадоваму гамельчуку далі 3 гады «хіміі» за каментар у «Тэлеграме»

18.10.2021



Віталь Маскалёў

Суддзя **Хлышчанкоў** у судзе Чыгуначнага раёну Гомля прызнаў **Віталя Маскалёва** вінаватым у абразе службовай асобы і пагрозе гвалту ў дачыненні да супрацоўніка МУС. Абодва злачынствы былі здзейснены ім у адным каментары ў тэлеграм-канале сайта «Моцныя навіны» напрыканцы жніўня 2020г. Абразлівы каментар быў адрасаваны падпалкоўніку ваенкому **Крываносаву**.

10 верасня 2020г. **Віталя Маскалёва** затрымалі супрацоўнікі ГУБАЗіК. Пасля допыту ў статусе падазраванага яго змясцілі на тры дні ў ізалятар часовага ўтрымання, а пасля яго адпусцілі дадому. Цягам трох месяцаў каля 5 разоў **Маскалёва** дапытвалі ў Следчым камітэце. Напрыканцы снежня следчы маёр **Шчурэвіч** праняў рашэнне аб спыненні крымінальнай справы супраць яго.

Віталь Маскалёў нарэшце змог уздыхнуць з палёгкай. Ён звольніўся з прадпрыемства, дзе працаваў кіроўцам і ўладкаваўся на расейскую фірму кіроўцам-міжнароднікам з заробкам у некалькі разоў болей, чым на прадпрыемстве. Але радасць яго была заўчасная.

У красавіку яго зноў выклікалі ў СК і следчая **Ірына Белаусава** паведаміла яму, што супраць яго адноўлена крымінальная справа.

Маскалёва пакінулі на воле пад паручальніцтва яго жонкі і пляменніцы. Па вяртанні з чарговага рэйсу з Украіны ён атрымаў позву ў суд.

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі



У судзе, які распачаўся 15 кастрычніка і, па рашэнні суддзі, быў закрытым, ён віну прызнаў цалкам і патлумачыў, што насамрэч напісаў абразлівы каментар пра Крываносава, але пагроза на яго адрас была выказана ў відавочна жартаўлівай форме.

> *«Да таго ж сам **Крываносаў** таксама пісаў каментары пад матэрыялам «Моцных навінах», – тлумачыць **Маскалёў**, – прапаноўваў сустрэцца незадаволеных яго паводзінамі на вул. Садовай. Я потым даведаўся, што гэта адрас ваенкамата, дзе ён працуе. Вось я жартам і напісаў, што калі да яго прыедуць хлапцы са слабымі нервамі, яму будзе кепска. Нашто **Крываносаў** сам прапаноўваў сустрэцца ў тым чаце?».*

Падчас працэсу **Віталь Маскалёў** не карыстаўся паслугамі адваката і бараніў сябе сам.

Пацярпелы ваенком не падаваў зыск на спагнанне матэрыяльнай кампенсацыі яго маральнай шкоды. На судзе ён не прысутнічаў, таму суддзя **Хлышчанкоў** зачытаў яго паказанні падчас следства, дзе **Крываносаў** адзначыў, што абразлівы каментар **Маскалёва** зняважыў яго гонар і годнасць і прынізіў яго ў вачах падначаленых.

Вердыкт суду – тры гады «хіміі» з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.

> *«Я мяркую, што пакаранне, надта жорсткае за каментар, – з сумам кажа **Віталь Маскалёў**. – Я насамрэч абразіў ваенкома, але пагроза на яго адрас была проста жартам. Лепш бы мне прысудзілі год турмы, чым тры гады «хіміі» у далечыні ад дому і сям'і. Я толькі тры месяцы папрацаваў дальнабоем і канешне не зарабіў столькі каб мая сям'я – жонка – выхавацелька ў садку і 13-гадовая дачка змаглі нябедна пражыць, калі я буду на «хіміі». А ім жа яшчэ давядзецца і мне там дапамагаць».*

Віталь Маскалёў яшчэ не прыняў рашэнне ці будзе ён падаваць апеляцыйную скаргу ў абласны суд на рашэнне суду Чыгуначнага раёну.



Аўтар **Ларыса Шчыракова**

Фота аўтара

Гомельская вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі


23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com